**ВУ́ЗЕЛ**, у народных вераваннях сімвал адзінства, непарыўнасці, любові, замацавання, лакалізацыі пэўнай з'явы. Развязванне В. насіла адваротны сэнс раз'яднання, разлучэння, паслаблення, нараджэння, смерці. У некаторых народаў В. з'яўляўся папулярным амулетам супраць злога вока. Павер'і, звязаныя з В., суправаджалі чалавека ўсё ягонае жыццё. Калі падчас шыцця ў В. завяжацца нітка — гэта значыла, што хтосьці прывяжацца да дзяўчыны. На вянчанні нявеста старалася развязаць паясныя В. (тое ж рабіў муж жонцы ў першую шлюбную ноч), каб ёй лягчэй было нараджаць дзяцей. Падчас родаў у хаце развязвалі ўсе В. — гэтак сімвалічна раз'ядноўвалася знітаванасць маці і дзіцяці. Па колькасці В. на пупавіне варажылі пра колькасць у маці дзяцей у будучым. Высушаную пупавіну завязвалі ў анучку, у вузельчык, які потым давалі развязваць падросламу дзіцяці, каб «развязваў розум», стаў спрытным, кемлівым, памятлівым. Пры кананні чалавека, як і пры родах, у хаце таксама развязвалі ўсе магчымыя В., каб душа лягчэй магла аддзяліцца ад спакутаванага цела. Памерламу маладому хлопцу завязвалі на шыі хусцінку ў В., як знак не завязанага ім пры жыцці сямейнага В. А пры ўбранні ў апошні шлях жанатых людзей не старога веку, наадварот, не завязвалі В., каб жывым удаве ці ўдаўцу неўзабаве давялося завязаць новы шлюб. Сустракаліся павер'і, звязаныя з В., і на працягу каляндарнага года. На Каляды ўвогуле забаранялася завязваць і развязваць В. Калі ж гэтая забарона парушалася, то пад канец Калядаў, на вадапосную куццю на нітцы навязвалася такая колькасць В., колькі было выканана забароненых работ, пасля чаго нітку выкідвалі за дровы ці спальвалі. У чысты чацвер у трох кутках хаты выпрадалі па 3 ніткі, якія лічыліся лекавымі ад ламоты пасля таго, як на іх яшчэ навязвалася па 9 В. Увесну, з прылётам буслоў, дзеці завязвалі В., каб нешта знайсці ўлетку, і для замацавання магічнага пажадання: «На ціхае лета, на буйнае жыта, а нам на добрае здароўе!». На дажынках пакінутая барада завязвалася ў В., пад які клалі ахвярны кавалак хлеба дзеля добрага ўраджаю поля на наступны год. Сярпом В. убіваўся ў ніву са словамі: «Ніўка, ніўка, падай маю сілку!». В. як магічная фігура даволі актыўна выкарыстоўваўся пры лячэнні розных немачаў. Знахары і шаптуны пры звіхах рук ці ног адначасова з чытаннем замоў і малітваў навязвалі на шнуры 9 вузельчыкаў, прывязвалі да пакалечанай часткі цела (тое ж рабілі і пры радзімцы, пярэпалаху), вымяраючы ўсе часткі цела, суставы, галаву, і той ніткаю з В. падкурвалі хворага. Ад сурокаў нітку з В. клалі ў кавалак хлеба і, завязаўшы ў анучку, неслі на скрыжаванне дарог. Пры засцераганні ад сурокаў насілі на руках і нагах чырвоныя суконныя ніткі, завязаныя ў 3 В. Ад зубнога болю завязвалі на шыі ці на руцэ шнурок з 27 В. Ад бародавак навязвалася столькі В., колькі іх выскачыла на целе; калі хто падыме тую нітку — да таго яны пяройдуць, і таму кідалі яе на сметніку, на раздарожжы, за 33 крокі ад крыжа, ці клалі пад пяткаю дзвярэй з разлікам: як В. сатруцца, так і бародаўкі знікнуць. Ад ліхаманкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

завязвалі хоць на чым 3 В., калі ўпершыню ўвесну бачылі бусла, і тыя В. давалі развязаць хвораму. А ў чысты чацвер пры чытанні 12 Евангелляў завязвалі 12 В. на суровай нітцы і апярэзваліся ёю ці кідалі нітку з В. ў бягучую ваду, каб з ёю сплыла і хвароба.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996. С. 112, 331; Тое ж. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 39, 101—102, 180, 209, 219, 257, 357, 732, 577; Тое ж. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. С. 66, 164, 190, 198, 210, 217, 225, 250—255, 270—272, 308, 587, 629.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ